АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

УДК 930.221(=84) «15»

СЕМЯНЧУК Альбіна Аляксандраўна

# ПОЛЬСКІЯ ХРОНІКІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI ст. ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

07.00.02.01

~~07.00.09~~ - гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычных даследаванняў (гістарычныя навукі)

## Аўтарэферат

дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Мінск - 1997

930

ЛННБ України ім.В.Стефаника
00425776 (V)

Работа выканана ў аддзеле спецыяль... ...х навук Інстытута гісторыі АН Беларусі.

Навуковы кіраўнік: кандыдат гістарычных навук
Г.Я.Галенчанка

Афіцыйныя апаненты: праф., доктар гістарычных навук
С.Александровіч
доктар гістарычных навук
Д.В.Караў

Апаніручая арганізацыя - Беларускі дзяржаўны Універсітэт

Абарона адбудзецца «18» чэрвеня 1997 г. у 14 гадзін на паседжанні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне навуковай ступені доктара навук пры Інстытуце гісторыі АН Беларусі (220072, г.Мінск, вул.Ф.Скарыны, 1)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа АН Беларусі.
Аўтарэферат разасланы «18» мая 1997 г. .

Вучоны сакратар савета,
кандыдат гістарычных навук     Грыгор'ева     В.В.Грыгор'ева

Інстытут гісторыі АН Беларусі
1997

Ав.70.944



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЫСЕРТАЦЫІ

**Актуальнасць даследавання.** Да даволі шырокага фонду наратыўных крыніц па гісторыі Вялікага княства Літоўскага належаць польскія хронікі другой паловы XVI ст. (Марціна і Яхіма Бельскіх, Марціна Кромэра, Мацея Стрыйкоўскага і іншых).

У беларускай гістарычнай навуцы польскія хронікі фактычна яшчэ не вывучаліся. Была абаронена адзіная дысертацыя Міхайлоўскай Л.Л. «Беларусь і Літва ў XIV-XVI стст. (па матэрыялах хронікі Бернарда Вапоўскага)», але яна не мела свайго працягу і засталася адзінай спробай увесці ў навуковы абарот гэту каштоўную групу крыніц.

На сёняшні дзень ёсць вострая неабходнасць зрабіць польскія хронікі другой паловы XVI ст. набыткам беларускай гістарыяграфіі. Ці маем мы на гэта права? Ні ў кога не выклікае сумненняў, што вельмі багатая інфармацыя па гісторыі старажытнай Русі і Вялікага княства Літоўскага ўтрымліваецца ў «Аналах» Яна Длугаша, аўтар якіх складаў іх да самай сваёй смерці ў 1480 годзе. Паведамленні прадаўжальнікаў Я.Длугаша - М.Мяхоўскага (за 1480-1506 гг.), Л.Ё.Дэцыя (за 1506-1516 гг.), Б.Вапоўскага (за 1516-1535 гг.), М.Бельскага (за 1535-1548), М.Стрыйкоўскага (другая палова XVI ст.) - набываюць характар крыніц. М.Кромэр, хаця і давёў сваю «Гісторыю» («De origine et rebus gestis Polonorum libri XXX») да 1506 г., не апісваючы сучаснай ему сітуацыі, таксама можа лічыцца добрасумленным інфарматарам, таму што карыстаўся аўтэнтычнымі дакументамі з розных афіцыйных устаноў. Усе храністы былі цесна звязаны з Вялікім княствам Літоўскім, якое ўспрымалася імі не проста як саюзная дзяржава, але як частка аднаго палітычнага арганізму. Такім чынам, не выклікае сумненняў, што даследчыкам гісторыі Вялікага княства Літоўскага трэба актыўна выкарыстоўваць польскія хронікі ў якасці крыніц. Што яны і робяць. Спасылкі на творы гэтых аўтараў апошнім часам усё часцей сустракаюцца на старонках беларускіх, польскіх і рускіх даследаванняў па палітычнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага (М.Ермаловіч, А.Ю.Дварнічэнка, М.М.Кром, К.Петкевіч і інш.).

Аднак адсутнасць ў беларускай гістарыяграфіі комплекснага даследавання аб польскіх хроніках другой паловы XVI ст. выклікае неабходнасць іх тэарэтычнага вывучэння. Польска- і лацінскамоўныя наратыўныя крыніцы, да якіх вымушаны звяртацца беларускія гісторыкі ў сваіх навуковых пошуках, як і ўсе помнікі сярэдневечнага пісьменства, з'яўляюцца вельмі складанымі і па форме, і па змесце. Выкарыстанню іх у гістарычных даследаваннях павінны папярэднічаць грунтоўны крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны аналіз, вырашэнне праблемы аўтэнтычнасці і верагоднасці гэтага гатунку крыніц.

Сучасны ўзровень развіцця гістарычнай навукі патрабуе новых падыходаў да вывучэння наратыўных крыніц: гістарычныя творы XVI ст. павінны разглядацца комплексна, як крыніцы і як уласна помнікі гістарыяграфіі, гэта значыць трактаваць дзейнасць як састаўную частку духоўнай культуры і разам з тым, як крыніцу да яе навуковага пазнання.

ЛНБ ім. В. СТЕФАНИКА НАН УКРАЇНИ

Тэма «Польскія хронікі другой паловы XVI ст. як крыніцы па гісторыі Вялікага княства Літоўскага» занадта шырокая, каб разглядзець усе магчымыя яе аспекты, таму для больш падрабязнага аналізу намі абраны толькі адзін аспект, асветлены храністамі, а менавіта этна-культурная і рэлігійная гісторыя ВКЛ. Гэтая тэматыка слаба распрацавана ў беларускай гістарыяграфіі. У той жа час у хроніках Бельскіх, Кромэра і асабліва Стрыйкоўскага захавалася даволі шмат цікавай, але не вывучанай на належным крыніцазнаўчым узроўні інфармацыі аб пачатковым этнагенетычным працэсе народаў ВКЛ, іх вераваннях і культуры. Агляд асноўных навуковых уяўленняў канца XVI ст. па гэтай праблеме дазваляе зразумець прыроду некаторых «памылак», у якіх абвінавачваюць М.Стрыйкоўскага, а таксама М. і Я.Бельскіх і М.Кромэра.

Для нас вывучэнне польскіх хронік важна таксама таму, што, як указваў М.Д.Прыселкаў, «упершыню аб беларускіх ці заходнярускіх летапісах руская навука даведалася з твораў польскіх храністаў XV і XVI ст.: Длугаша, Бельскага і Стрыйкоўскага». Сапраўды, ні ў каго не выклікае сумненняў, што польскае дзеяпісарства цесна звязана з беларуска-літоўскім летапісаннем і ўкраінскай гістарыяграфіяй XVII-XVIII стст. Беларуска-літоўскія летапісы, якія даўно і плённа вывучаюцца ў беларускай гістарыяграфіі, немагчыма разглядаць без дакладнага аналізу польскіх хронік, што паказаў М.М.Улашчык .

Але гэта толькі адна з прычын неабходнасці вывучэння польскіх хронік другой паловы XVI ст. Гэтая каштоўная група наратыўных крыніц адлюстроўвае стан вывучэння мінуўшчыны Вялікага княства Літоўскага на канец XVI ст., калі гэтыя творы былі фактычна адзінай друкаванай крыніцай інфармацыі аб мінулым ВКЛ. Мы не можам атрымаць уяўлення аб узроўні гістарычнай навукі на Беларусі на той час, не аналізуючы польскіх хронік. «Хроніка Польская» Мацея Стрыйкоўскага, якая пісалася на беларускіх землях і мае да іх непасрэднае дачыненне, найбольш тэрмінова патрабуе вывучэння з боку беларускіх даследчыкаў як гістарычная крыніца і як твор гістарыяграфіі XVI ст. Але вывучаць яе ізалявана, у адрыве ад іншых прац гэтага кшталту, нельга. Таму трэба даследаваць таксама жыццё і дзейнасць Марціна і Яхіма Бельскіх, Марціна Кромэра, і іншых храністаў таго часу. Такім чынам, паўстае надзённая патрэба пачаць мэтанакіраванае вывучэнне польскіх хронік 2-й паловы XVI ст. як крыніц па гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў цэлым і па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі ў прыватнасці, што дазволіць рабіць навукова абгрунтаваныя рэканструкцыі першапачатковых этапаў этнічнай і рэлігійнай гісторыі Беларусі.

**Мэты і задачы даследавання.** Мэта дысертацыі - даказаць, што польскія хронікі другой паловы XVI ст. з'яўляюцца грунтоўнай і верагоднай крыніцай па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага; увесці іх у шырокі навуковы абарот у Беларусі. Згодна гэтай мэты ў рабоце вырашаюцца наступныя задачы:

- вылучыць крыніцы паведамленняў аб Вялікім княстве Літоўскім у польскіх храністаў 2-й паловы XVI ст. з мэтай вызначэння іх аўтэнтычнасці і верагоднасці;
- прааналізаваць асноўныя звесткі хронік, якія датычацца этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага;
- прасачыць гісторыю вывучэння польскіх хронік 2-й паловы XVI ст., яе этапы і накірункі;
- паказаць дыялектыку сувязі паміж асабістай пазіцыяй, жыццёвым асяроддзем аўтараў і іх гістарыяграфічнай канцэпцыяй.

**Навуковая навізна дысертацыі** заключаецца ў тым, што яна падводзіць пэўныя вынікі папярэдніх гістарычна-крыніцазнаўчных даследаванняў аб польскіх хроніках 2-й паловы XVI ст., абагульняе і ўводзіць ў абарот увесь сабраны да гэтага часу матэрыял па іх вывучэнні. Упершыню робіцца спроба даць вызначэнне паняцця «польскія хронікі», а таксама ўвесці ў навуковы ўжытак у беларускай гістарыяграфіі тэрміна «дзеяпісарства». Супастаўляюцца крыніцы паведамленняў хронік М.Стрыйкоўскага, М. і Я.Бельскіх, М.Кромэра па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, сабраны разам і комплексна прааналізаваны матэрыялы гэтых храністаў па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі ВКЛ. Дысертантам выяўлены і апісаны выданні польскіх хронік 2-й паловы XVI ст. ў аддзеле рэдкай кнігі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. З мэтай даследавання папулярнасці і абсягу распаўсюджання хронік Стрыйкоўскага, Бельскіх, Кромэра і іншых на беларускіх землях аналізаваліся каталогі касцельных бібліятэк. Абагульняюцца, дапаўняюцца і ўдакладняюцца раней зробленыя высновы і прыпушчэнні, якія датычацца жыцця, дзейнасці, канцэпцый і крыніц інфармацыі разглядаемых храністаў.

**Эканамічная і практычная значнасць дысертацыі.** Атрыманыя вынікі і матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў далейшай распрацоўцы гістарычна-крыніцазнаўчай праблематыкі гісторыі Беларусі, пры складанні хрэстаматый і зборнікаў дакументаў па беларускай гісторыі часоў Вялікага княства Літоўскага, пры падрыхтоўцы лекцый і спецкурсаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, вынесеныя на абарону.**
Аналіз і абагульненне атрыманых матэрыялаў дазваляе вынесці на абарону наступныя палажэнні:

1. Польскія хронікі 2-й паловы XVI ст. складаюць вялікі корпус наратыўных крыніц, якія могуць і павінны быць выкарыстаны ў беларускай гістарыяграфіі. Гісторыя іх вывучэння налічвае больш за 400 год; напісана вялікая колькасць польскіх даследаванняў, якія практычна невядомы ў Беларусі. У апошнія гады да гэтага працэсу далучыліся навукоўцы Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі.
2. Хронікі Бельскіх, Кромэра, Стрыйкоўскага ўтрымліваюць найбольшую колькасць каштоўнай інфармацыі па гісторыі ВКЛ, што звязана з блізкім знаёмствам іх аўтараў з рэаліямі палітычнага, грамадскага, рэлігійнага, культурнага жыцця гэтага дзяржаўнага ўтварэння. Жыццёвыя шляхі

храністаў праходзілі праз беларускія землі, яны пакінулі прыкметны ўклад у гісталыі духоўнай культуры Беларусі.

3. З усяго комплексу паведамленняў польскіх хронік асаблівую цікавасць уяўляе інфармацыя аб этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі ВКЛ. Асноўнымі крыніцамі паведамленняў храністаў 2-й паловы XVI ст. былі як звесткі папярэднікаў - Длугаша, Мяхоўскага, Вапоўскага, Дэцыя і іншых, так і беларуска-літоўскія летапісы, а таксама ўласныя назіранні і дачыненні з матэрыяльнай і духоўнай культурай народаў ВКЛ.
4. Этнакультурныя і рэлігійныя ўяўленні польскіх храністаў 2-й паловы XVI ст. адпавядалі тагачаснаму ўзроўню ведаў. Многія фантастычныя і біблейскія сюжэты, якія сустракаюцца на старонках хронік, абумоўлены тэарэтычнымі канцэпцыямі, якія храністы прымалі альбо стваралі самі. Крытычны разбор падобных канцэпцый уяўляе асобную гістарыяграфічную цікавасць. Крыніцазнаўчы аналіз дазваляе меркаваць аб дастаткова высокай ступені аўтэнтычнасці і верагоднасці паведамленняў аб этнічнай, культурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

**Апрабацыя і практычнае прымяненне даследавання.** Асноўны змест дысертацыі абмяркоўваўся на паседжаннях аддзела спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі АН Беларусі. Асобныя палажэнні знайшлі адлюстраванне ў публікацыях аўтара і выступленнях на навуковых канферэнцыях ў перыяд з 1991 па 1996 год: «Культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII - пачатку XX стст.» (Гродна, 1991), «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» (Полацк, 1992), «Народ і рэлігія» (Гданьск, 1993), «Браслаўскія чытанні» (Браслаў, 1994), «Замежная архіўная беларусіка» (Мінск, 1996), «Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII - XX ст.» (Гродна, 1996). Вынікі працы выкарыстоўваюцца дысертантам ў вучэбна-педагагічнай і папулярызатарскай рабоце: правядзенні лекцый, напісанні навуковых і навукова-папулярных артыкулаў.

**Структура дысертацыі** абумоўлена мэтай і задачамі даследавання і складаецца з ўводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння. Да дысертацыі дадаюцца спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры, археаграфічнае апісанне выданняў польскіх хронік з Аддзела рэдкай кнігі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея і альбом ілюстрацый.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Першая глава** прысвечана агляду 400-гадовага перыяду вывучэння польскіх хронік 2-й паловы XVI ст. Яна складаецца з пяці раздзелаў. У першым разглядаюцца асноўныя крыніцы па тэме дысертацыі. Яны падзяляюцца на друкаваныя і рукапісныя. Галоўнымі сярод друкаваных з'яўляюцца самі польскія хронікі другой паловы XVI ст.: «Хроніка ўсяго

свету» Марціна Бельскага; «Хроніка Польская» Яхіма Бельскага; «De origine et rebus gestis Polonorum...» Марціна Кромэра, а таксама «Хроніка Польская, Літоўская, Жмудзкая і Ўсёй Русі» Мацея Стрыйкоўскага і яго ж праца «Аб пачатках... народу літоўскага...» («O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego...»), якая пабачыла святло толькі ў 1978 г. Разглядаюцца таксама і творы іншых храністаў, якія з'яўляліся першакрыніцамі інфармацыі для Бельскіх, Кромэра і Стрыйкоўскага, і якія робяць магчымым крыніцазнаўчы аналіз - гэта працы В.Кадлубка, П.Дусбурга, Я.Длугаша, Б.Вапоўскага, М.Мяхоўскага, Ё.Л.Дэцыя, С.Гэрберштэйна, Р.Гэйдэнштэйна, Я.Д.Салікоўскага, С.Сарніцкага, Л.Гурніцкага, С.Ажахоўскага і інш.

Крыніцазнаўчы аналіз названых твораў дазваляе вылучыць верагодную інфармацыю аб этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага, якую потым можна выкарыстоўваць для тэарэтычных разважанняў. Самай багатай і змястоўнай з пункту гледжання цікавячай нас тэмы, з'яўляецца «Хроніка Польская, Літоўская, Жмудзкая і Ўсёй Русі» Мацея Стрыйкоўскага, бо ў ёй не проста выкладзены факты з гісторыі ВКЛ, але створана шырокая панарама гістарычнага жыцця народаў старажытнай беларуска-літоўскай дзяржавы і яе суседзяў, апісаны звычаі і абрады, традыцыйныя вераванні і паданні, легенды і сучасныя аўтару гісторыка-геаграфічныя і этнагенетычныя ўяўленні. Падобны «недахоп» у хроніках Бельскіх і Кромэра кампенсуецца багаццем палітычных падзей.

Польскія хронікі 2-й паловы XVI ст. немагчыма аналізаваць без даследавання старажытнарускіх («Аповесці мінулых часоў») і беларуска-літоўскіх летапісаў.

Аб шырокай папулярнасці польскіх хронік сведчыць вялікая колькасць іх усходнеславянскіх перакладаў, з якімі аўтар працаваў у рукапісным аддзеле Расійскай Нацыянальнай Бібліятэкі імя М.Е.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу, а таксама каталогі кляштарных бібліятэк гродзенскіх, брэсцкіх, навагрудскіх езуітаў, у якіх прадстаўлены назвы практычна ўсіх разглядаемых хронік.

**У другім раздзеле** першай главы разглядаюцца агульныя працы аб польскіх хроніках 2-й паловы XVI ст. Апошнія былі прадметам як манаграфічных, так і сінтэтычных прац. На працягу чатырох стагоддзяў іх існавання змяняліся накірункі гістарыяграфіі, але цікавасць да гэтага жанру гістарычнага пісьменніцтва заўсёды заставалася вострай. Па-першае, хронікі выкарыстоўваліся як крыніцы інфармацыі і аргументацыі па самых разнастайных пытаннях. Па-другое, яны вызначалі ўзровень інтэлектуальнага развіцця тагачаснага грамадства і таму вабілі да сябе гісторыкаў літаратуры, мастацтва, грамадска-палітычнай думкі. Па-трэцяе, у апошнія часы, не страціўшы свайго крыніцазнаўчага значэння, хронікі ўсё часцей робяцца аб'ектам вывучэння вузкай навуковай дысцыпліны - гісторыі гістарыяграфіі. Але да гэтага часу не з'явілася абагульняючай працы, якая б падвяла рысу пад 400-гадовым перыядам вывучэння польскіх хронік другой

паловы XVI ст., вызначыла перыяды і праблемы гэтага працэсу і па магчымасці ўказала накірункі далейшых даследаванняў.

Згодна храналагічна-сістэматычнаму прынцыпу, гісторыя вывучэння польскіх хронік другой паловы XVI ст. пачынаецца з агульных прац гістарычна-літаратуразнаўчага, гістарычнага і гістарыяграфічнага характару, а таксама з энцыклапедый і бібліяграфій, а потым аналізуюцца працы, звязаныя з жыццём і творчасцю паасобных храністаў. Сярод агульных прац у гістарыяграфічным аглядзе вылучаны працы па этнарэлігійнай і культурнай праблематыцы Вялікага княства Літоўскага.

Першымі даследчыкамі польскіх хронік можна лічыць саміх храністаў другой паловы XVI ст. Кожны з іх браўся за складаную працу стварэння свайго вобразу мінуўшчыны, не задавальняючыся творамі папярэднікаў. Першай уласна гістарыяграфічнай працай, у якой узгадваюцца хронікі другой паловы XVI ст., з'яўляецца твор Сымона Старавольскага «Сто польскіх пісьменнікаў» («Setnik pisarzow polskich»), у якім ён сабраў біяграфіі ста самых выдатных, на яго погляд, польскіх пісьменнікаў.

Агульных прац па гісторыі польскай літаратуры, у тым ліку другой паловы XVI ст., пачынаючы ад С.Старавольскага і С.Я.Гопіуса і скончваючы найноўшымі кнігамі Ч.Мілаша і Я. Пэльца, налічваецца некалькі дзесяткаў (глядзі «Bibliografia literatury Polskiej «Nowy Korbut». Pismiennictwo staropolskie. T.1). Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца шматтамовыя выданні з памежжа літаратуразнаўства і гістарыяграфіі: творы Ф.Бенткоўскага, Ю.М.Асалінськага, М.Вішнеўскага. Асобную групу агульных прац аб польскіх хроніках 2-й паловы XVI ст. складаюць гістарычныя манаграфіі, якія датычацца праблематыкі польскага дзяпісарства, Галэмбёўскага, Вуйціцкага, Надольскага, Барыча, Улевіча. Разглядаюцца таксама працы энцыклапедычнага і бібліяграфічнага характару.

**У трэцім раздзеле** аналізуюцца даследаванні, прысвечаныя Марціну і Яхіму Бельскім. Аўтар дысертацыі адрознівае асноўныя творы гэтых двух пісьменнікаў: аўтарства «Хронікі Польскай» 1597 года выдання прыпісваецца Яхіму Бельскаму, нягледзячы на тое, што за аснову ў ёй узята адпаведная частка «Хронікі ўсяго свету» Марціна Бельскага, і ён жа дапрацоўваў апошнюю да канца свайго жыцця. Аднак сын змяніў канцэпцыю ўсяго твору, зрабіўшы яго «першай шляхецкай гісторыяй» (Л.Фінкель), дадаў шмат новых фактаў і літаратурна апрацаваў. Ю.М.Асалінські, які прысвяціў Бельскім першы том свайго 4-тамовага выдання «Гістарычна-крытычныя звесткі па гісторыі польскай літаратуры», яшчэ не адрозняў Марціна ад Яхіма Бельскага. Аднак Хадыніцкі, і асабліва Сабешчаньскі і Павіньскі, якія напісалі па некалькі артыкулаў аб жыцці і дзейнасці абодвух аўтараў, відавочна, лічаць «Хроніку Польскую» пераважна творам Яхіма. Галоўнай манаграфіяй, у якой разглядаюцца жыццё і творчасць Марціна Бельскага, з'яўляецца кніга І.Хшаноўскага «Марцін Бельскі: Гістарычна-літаратурнае даследаванне». У ёй асвятляюцца розныя бакі жыцця і дзейнасці храніста. У цэлым даследчык ацэньвае

Марціна Бельскага ніжэй, чым, скажам, Марціна Кромэра: «Кромэр паступова абтрасаецца ад сярэднявеччыны, Бельскі жа сядзіць у ёй па самыя вушы». Хшаноўскі удакладніў, што асноўнай крыніцай па гісторыі Польшчы ў «Хроніцы свету» з'яўляецца не Вапоўскі, а Мехавіта, Дэцый і Вапоўскі, разам з уласнымі паведамленнямі. На жаль, даследчык не зрабіў поўнага крытычнага разбору хронікі.

Два артыкулы прысвяціў «Хроніцы свету» А.І.Рогаў - «Паведамленні па гісторыі Расіі ў «Хроніцы ўсяго свету» Марціна Бельскага» і «Асноўныя асаблівасці развіцця руска-польскіх культурных сувязяў у эпоху Адраджэння».

Аб Яхіме Бельскім напісана толькі адна невялічкая манаграфія Ул.Нейрынга. Пра яго, праўда, пісалі Багамолец, Асалінскі, Сабешчанскі, але з пункту гледжання мовы, складу, зместу яго твораў, абмінаючы крытычны бок, хаця ўжо яны пачалі разумець, што трэба разглядаць і крыніцы вельмі цікавай і каштоўнай «Польскай хронікі» 1597 года. Аднак і Нейрынг не рабіў падрабязна крытычнага разбору хронікі.

Украінскі даследчык С.Лепяўка разглядаў «Польскую хроніку» Яхіма Бельскага як крыніцу па гісторыі казацкіх паўстанняў 1594-1596 гг. на Ўкраіне, параўноўваючы яе з «Rerum polonicarum» і іншымі творамі Р.Гэйдэнштэйна.

**Чацьверты раздзел** першай главы прысвечаны даследаванням аб Марціне Кромеры. У ім адзначаецца, што творы гэтага храніста былі папулярны яшчэ да выхаду ў свет яго галоўнай працы «Гісторыя Польшчы» (1555 г.). Аб ім напісаны чатыры манаграфіі - А.Эйхгарна, Ц.Валеўскага, С.Бодняка і Л.Фінкеля. З іх тры першыя прысвечаны ў асноўным жыццю і дзейнасці Кромэра і толькі ў апошняй «Марцін Кромэр, польскі гісторык XVI ст. Крытычны разбор» падрабязна аналізуюцца яго творы, асабліва «Гісторыя Польшчы». Згодна з герменэўтычнай метадалогіяй Фінкель даследаваў твор Кромэра з пункту гледжання першакрыніц, галоўнай сярод якіх, безумоўна, былі «Аналы» Я.Длугаша. Але Кромэр пайшоў далей за свайго славутага папярэдніка. Каштоўная манаграфія Л.Фінкеля на сёняшні дзень ужо састарэла. Патрабуюцца новыя комплексныя падыходы да тэмы, не столькі крытычны разбор крыніц, колькі аналіз уласнай пазіцыі аўтара, арыгінальнасці яго паведамленняў.

Жыццё і творчасць храніста ўвесь час цікавілі Г.Барыча, які напісаў артыкул пра М.Кромэра ў Польскі Слоўнік Біяграфічны і супаставіў паміж сабой галоўныя творы Я.Длугаша і М.Кромэра у сваёй манаграфіі «Шляхамі старапольскага дзеяпісарства». Г.Барыч лічыў М.Кромэра адной з галоўных постацяў польскага Адраджэння.

Асоба Кромэра была ў цэнтры ўвагі Сімпозіўма да ўшанавання 400-годдзя яго смерці, які адбыўся 23-24 мая 1989 г. у Ольштыне. У рэфератах вядомых польскіх гісторыкаў, якія адлюстроўваюць увесь шырокі спектр даследаванняў, звязаных з Марцінам Кромэрам (у якім, аднак, адсутнічае тэма «М.Кромэр і Вялікае княства Літоўскае»), разглядаліся розныя бакі шматграннай дзейнасці Марціна Кромэра.

У **пятым раздзеле першай главы** дысертацыі аналізуецца стан вывучэння жыцця і творчасці Мацея Стрыйкоўскага. На сёняшні дзень гэты храніст, - мусіць, самы папулярны сярод усіх гістарыёграфаў другой паловы XVI ст., - дачакаўся манаграфіі А.І.Рогава «Руска-польскія культурныя сувязі ў эпоху Адраджэння (Стрыйкоўскі і яго Хроніка)» і дзвух грунтоўных прац польскіх даследчыкаў - Ю.Радзішэўскай і Зб.Вайткавяка, прысвечаных у асноўным творчай біяграфіі храніста. Першая з названых прац падрабязна разглядае летапісныя і некаторыя іншыя крыніцы паведамленняў хронікі Стрыйкоўскага. Нядаўна былі выдадзены рэпрынт «Хронікі Польскай» 1846 года выдання і ўпершыню - «Аб пачатках... народу літоўскага...» (1978 г.). Акрамя гэтага шматлікія артыкулы польскіх, рускіх, літоўскіх і беларускіх аўтараў аналізуюць розныя бакі творчай спадчыны Стрыйкоўскага. Сярод іх адным з найбольш грунтоўных з'яўляецца артыкул Ю.Бардаха «Мацей Стрыйкоўскі і яго творчасць у святле найноўшых даследаванняў». На сёняшні дзень лепшае апрацаванне аб жыцці і дзейнасці Мацея Стрыйкоўскага - гэта кніга Зб.Вайткавяка «Мацей Стрыйкоўскі - дзеяпіс Вялікага княства Літоўскага. Каляндар жыцця і дзейнасці». Але, на жаль, у задачу аўтара не ўваходзіла аналізаваць крыніцы твораў Стрыйкоўскага, асабліва па гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

Аднак падобную задачу, у прыватнасці, ставіў перад сабой і бліскуча выканаў выдатны беларускі даследчык М.М.Улашчык у сваёй манаграфіі «Введение в изучение белорусско-литовского летописания», у якой трэці раздзел «Летописные источники Мацея Стрыйковского» прысвечаны даследаванню летапісаў, якія былі важнымі крыніцамі для храніста пад час напісання ўсіх яго твораў.

Постаць Мацея Стрыйкоўскага **вабіць да сябе ўвагу** літоўскіх гісторыкаў - Янінаса, Забарскайтэ, Куоліса і інш.

Фенамен Мацея Стрыйкоўскага ў беларускай гістарыяграфіі яшчэ мала даследаваны. Былі спробы разглядаць асобныя пытанні, звязаныя з яго творчасцю, але асноўныя працы аб ім наперадзе.

Нарэшце, апошні, **шосты раздзел** першай главы прысвечаны праблеме перакладаў польскіх хронік другой паловы XVI ст. на ўсходнеславянскія мовы. Сам факт з'яўлення падобных перакладаў сведчыў аб шырокай папулярнасці іх у суседніх краінах, узровень развіцця гістарычнай навукі ў якіх быў ніжэйшы. Раздзел падзяляецца на некалькі падраздзелаў, у якіх разглядаюцца ўплывы польскіх хронік на рускую, украінскую і беларускую гістарыяграфіі XVI - XVIII стст. Адзначаецца, што спачатку рабіліся тлумачэнні на старабеларускую і стараўкраінскую мовы, а потым ужо на так званы вялікарускі дыялект. Так было з «Хронікай усяго свету» Марціна Бельскага, пераклад якой па загаду Жыгімонта Аўгуста зрабіў шляхціц Вялікага княства Літоўскага Амброжый Брэжэўскі (разам з перакладам хронікі Мацея Стрыйкоўскага ён стварае канвалют з Расійскай Нацыянальнай Бібліятэкі імя М.Е.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу). Вядома, што Алехна Станковіч зрабіў пераклад «Апісання еўрапейскай Сарматыі» А.Гвагніна на старабеларускую мову ў XVI ст. На

расійскую мову перакладаў «Гісторыю» М. Кромэра К.А.Кандратовіч у XVIII ст. для В.М.Тацішчава. Аднак самай вялікай папулярнасцю карысталася хроніка М. Стрыйкоўскага, якая разам з «Хронікай свету» М.Бельскага перакладалася на старабеларускую мову, а ў XVII ст. чатыры разы - на рускую мову (захавалася каля 30 спісаў перакладаў як усяго помніка, так і асобных яго раздзелаў).

Польскія хронікі 2-й паловы XVI ст. пакладзены ў аснову шматлікіх хранографаў XVII - XVIII ст., «Хронікі з летапісцаў старадаўніх» Феадосія Сафановіча, «Палінодыі» Захарыя Капысценскага, «Пацерыкона» Сільвестра Косава, «Сінопсіса» Інакенція Гізеля, «Хронікі літоўскай і жмойцкай».

У першай главе дысертацыі, фактычна, у першыню даследуецца агульны стан вывучэння польскіх хронік другой паловы XVI ст. і згодна распрацаванай класіфікацыі аналізуюцца асноўныя працы, звязаныя з дадзенай тэматыкай. Адпаведна паказана, якія бакі творчасці храністаў вывучаны лепей, які горш, якія ў сувязі з гэтым паўстаюць перспектывы перад беларускімі даследчыкамі польскіх хранік. Менавіта ў выніку вывучэння папярэдніх даследаванняў аб польскіх хроніках XVI ст. мы ведаем, якія ўрыўкі хронік Бельскіх, Кромэра, Стрыйкоўскага заслугоўваюць даверу і могуць быць выкарыстаны як крыніцы.

**Другая глава** дысертацыі прысвечаны жыццяпісам М.Стрыйкоўскага, М. і Я.Бельскіх, М.Кромэра і складаецца з трох раздзелаў. У **першым** падкрэсліваецца вялікая роля Мацея Стрыйкоўскага ў фармаванні гістарыяграфічнай традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім і ўплыў на ягоную гістарычную канцэпцыю сацыяльна-палітычных рэалій у ВКЛ. Калі для польскай гістарыяграфіі постаць Стрыйкоўскага другасная (пасля Мяхоўскага, Кромэра, Вапоўскага ды іншых), дык для беларускіх даследчыкаў яна адна з галоўных: Стрыйкоўскі - заснавальнік навуковай гістарычнай традыцыі, першы гістарыёграф Вялікага княства Літоўскага, а яго творы - каштоўная крыніца ведаў пра мінулае Беларусі. У аўтабіяграфічных урыўках «Хронікі Польскай» і «Аб пачатках...» храніст адзначае сваё добразычлівае стаўленне да новай радзімы, куды ён прыехаў 16-гадовым хлопцам, і захапленне яе велічным і гераічным мінулым. Як іншыя выхадцы з Кароны (А.Ратундус, С.Будны), ён хутка натуралізаваўся ў новым асяроддзі і назаўсёды звязаў свой лёс з ВКЛ. Тут ён служыў у Віцебскім гарнізоне пад кіраўніцтвам Аляксандра Гвагніна. Магчыма, выконваў функцыі рыскуна пад час Лівонскай вайны. Пасля дыпламатычнай місіі ў Турцыю з Андрэям Тараноўскім (восень 1574 - вясна 1575 г.) зноў вярнуўся ў Літву і працягваў свае творчыя заняткі: напісаў «Sarmatiae Europeae Descriptio», над якім «упарта працаваў... амаль восемь гадоў», але рукапіс якога «загінуў у Харошчы пры пане Аляксандры Хадкевічу» (праўдападобна, быў украдзены А.Гвагнінам і выдадзены ім пад сваім іменем у 1578 г.). Яшчэ да ўдзелу ў турэцкім пасольстве напісаў гістарычна-маралізатарскі твор «Ганец цноты» (Кракаў, 1574 г.), у якім пачаў

выпрацоўваць сваю гістарычную канцэпцыю, развітую пазней у творах «Аб пачатках...» і ў «Хроніцы Польскай» (1582 г.).

Прадпрыняць падобную агромністую працу можна было толькі пры падтрымцы з боку вядомых у Вялікім княстве Літоўскім людзей. Сапраўды, беларуска-літоўскія магнаты, якія былі мецэнатамі і апекунамі маладога гісторыка (Хадкевічы, Алелькавічы-Слуцкія, М.Гедройць), аказвалі яму розную дапамогу - ад фінансавай да забеспячэння яго сямейнымі дакументамі, рукапісамі і кнігамі з уласных бібліятэк. Дарэчы, мецэнаты належалі да розных палітычных плыняў, але не аказвалі ціску на храніста, іх уплывы на яго не мелі непасрэднага характару. Адназначна можна сцвярджаць, што ўсім зместам і пафасам сваёй «Хронікі» Стрыйкоўскі ўзмацняў пазіцыі літоўскіх і беларускіх магнатаў і шляхты, якія асабліва пасля Люблінскай уніі імкнуліся падкрэсліць сваё асобнае месца ў федэратыўнай дзяржаве.

Супярэчлівы лёс і шматбаковая дзейнасць Мацея Стрыйкоўскага ў Вялікім княстве Літоўскім дазваляюць многае зразумець у ягонай творчасці. Палітычныя погляды, рэлігійныя перакананні, умовы жыцця, сучасны стан навуковых ведаў - усё гэта ўплывала на фармаванне ягонай гістарычнай канцэпцыі, без уліку якой нельга рабіць крыніцазнаўчага аналізу твораў храніста. Павярхоўнае іх прачытанне прыводзіць да сцверджанняў, што ён «увогуле быў фантазёрам і кампілятарам». Такі спрошчаны падыход не можа даць плённых вынікаў. Пры адпаведным жа крыніцазнаўчым аналізе паведамленняў храніста з улікам ягонай гістарычнай канцэпцыі можна шырока выкарыстоўваць творы Стрыйкоўскага ў гістарычных рэканструкцыях.

**Другі раздзел другой** главы дысертацыі прысвечаны двум іншым хроністам XVI ст. - Марціну і Яхіму Бельскім. Першаму з іх належыць «Хроніка ўсяго свету», якая яшчэ пры жыцці пісьменніка была выдадзена тры разы (1551, 1554, 1564), кожны раз пашыралася і удасканальвалася аўтарам. Гэта была першая ў Польшчы спроба стварэння навуковага гісторыка-геаграфічнага апісання тагачаснага свету, і, фактычна, першы падручнік па агульнай гісторыі. У гэтым сэнсе яна была вельмі папулярна і ў Вялікім княстве Літоўскім.

Жыццёвыя абставіны Марціна Бельскага моцна паўплывалі на яго гістарычную канцэпцыю. Маладосць, праведзеная ў «рускіх землях», блізкія адносіны з рэфармацыйным колкам Анджэя Тшацескага ў Кракаве, вайсковая кар'ера наклалі адбітак на светапогляд храніста, які, ў сваю чаргу, адлюстраваўся ў яго творах. Пратэстанцкія погляды Марціна Бельскага прывялі да таго, што адной з характэрных асаблівасцяў «Хронікі ўсяго свету» была яе рэфарматарскай тэндэнцыя, з-за чаго яна была занесена ў спіс забароненых кніг, аднак і ў XVI і пазней, у XVIII ст., калі была перавыдадзена езуітам Ф.Багамольцам у «Зборы дзеяпісаў польскіх» (1764), займала значнае месца ў гістарыяграфіі Рэчы Паспалітай. Другой асаблівасцю «Хронікі свету» з'яўляецца яе рыцарскі характар, што паўплывала на падбор матэрыяла і спосаб яго падачы. Храніст удзельнічаў у

знакамітых бітвах свайго часу: магчыма, пад Мохачам (1526 г.), пры Абертыне (1531 г.) і іншых, - таму любіў пісаць у асноўным аб палітычных і вайсковых падзеях, лічыў, што «мір шкодзіць». Гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў «Хроніцы свету» прысвечана не шмат месца (улічваючы даўнюю «нехэньць» польскіх храністаў да Літвы).

Яго сын Яхім, будучы сакратаром Жыгімонта III і значна больш адукаваным чалавекам, перарабіў працу бацькі, якую той пісаў да апошняга дня свайго жыцця і выдаў у 1597 годзе пад назвай «Хроніка Польская Марціна Бельскага нанова праз Яхіма Бельскага, сына яго, выдадзеная». Была зменена ўся канцэпцыя твора, у выніку чаго ён набыў характар «шляхецкіх рочнікаў». Яхім Бельскі ў сваім творы улічыў усе набыткі дзеяпісарскага жанру, у тым ліку выдадзеную ў 1582 г. «Хроніку Польскую» Мацея Стрыйкоўскага. Шмат звестак па гісторыі ВКЛ ён запазычыў менавіта ў апошняга.

**Трэці раздзел другой главы** дысертацыі прысвечаны жыццю і дзейнасці Марціна Кромэра, які, дзякуючы сваім здольнасцям, дасягнуў высокіх пасадаў у грамадскім і рэлігійным жыцці.У адрозненні ад Бельскіх і Стрыйкоўскага ён атрымаў шырокую еўрапейскую адукацыю, быў доктарам «абодвух праў», пазнаёміўся з гуманістычнай культурай, новымі тэндэнцыямі ў гістарыяграфіі, што паўплывала на навуковы ўзровень ягоных твораў: з ім у XVI ст. не маглі параўнацца ніякія іншыя польскія пісьменнікі. Аднак бясспрэчная навуковая неперавзыдзеннасць, шмат у чым наватарская метадалогія не пазбавілі Кромэра недахопаў. Будучы асцярожным і дыпламатычным чалавекам, ён адназначна прымаў пазіцыю двара з характэрнымі для яго непрызнаннем шляхецкага парламентарызму і патрабаваннем моцнай каралеўскай улады. Ён часта бываў у Вільні, удзельнічаў у Люблінскім сейме 1569 года, аднак не пісаў аб гэтым у сваёй «Гісторыі», апавяданне ў якой скончыў 1506 годам. Такім чынам, яго твор носіць пераважна кампіляцыйны характар, як і іншыя хронікі гэтага кшталту. Але Кромэр больш актыўна працаваў у архівах (упарадкаваў каронны архіў у 1550-1551 г.), карыстаўся вялікай колькасцю аўтэнтычных дакументаў (некаторыя з якіх не захаваліся да нашых дзён), што надае ягоным творам характар крыніц. «Гісторыя» Кромэра мела ў пэўнай ступені дзяржаўны характар: стаяла на варце агульнадзяржаўных інтарэсаў, супрацьстаяла як правінцыяльнаму сепаратызму (літоўскаму і прускаму), так і ўпрывілеяванню пэўных грамадскіх класаў, у першую чаргу шляхты, рэпрэзэнтуючы палітычную праграму першага перыяду панавання Жыгімонта Аўгуста.

Нягледзячы на розныя жыццёвыя абставіны, Бельскіх, Кромэра і Стрыйкоўскага аб'ядноўвае агульнае жаданне прынесці як мага больш карысці сваёй роднай (альбо набытай, як у выпадку з М.Стрыйкоўскім) краіне і суайчыннікам. Падобнае разуменне доблесці дамінавала ў XVI ст. і адтуль перайшло ў наступныя эпохі. Сёння мы мяркуем аб гэтым стагоддзі па дзеячах, якія пакінулі найбольш заметны след у гісторыі, але трэба ўлічваць, што самі яны фармаваліся пад уплывам тых гістарычных абставін,

таго асяроддзя і ідэалогій, якія панавалі ў іх часы. Усё гэта пакінула выразны след не толькі ў біяграфіях названых аўтараў, але прасочваецца ў канцэпцыях іх твораў.

**Трэцяя глава** дысертацыі прысвечана праблеме гістарычнай верагоднасці і адэкватнасці польскіх хронік другой паловы XVI ст. і складаецца з шасці раздзелаў. У **першым** адзначаецца, што праблема мае гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы аспекты. З пункту гледжання гістарыяграфіі мы разглядаем развіццё гістарычных канцэпцый польскіх гісторыкаў, змены свядомасці і пануючых ідэалогій; у той час як крыніцазнаўчы аналіз прадугледжвае даследаванне тых жа хронік з пазіцый верагоднасці інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца і той ролі, якую дадзеныя крыніцы адыгралі ў жыцці грамадства. Разам з тым гістарыяграфія і крыніцазнаўства бяруць адзін у аднаго атрыманыя ў выніку даследавання дадзеныя і ўзаемна дапаўняюць іх. Без уліку гістарычнай канцэпцыі аўтара нельга правільна ацаніць верагоднасць крыніцы. З другога боку, дакладнасць у перадачы фактычнага матэрыялу альбо яго фальсіфікацыя неад'емныя ад агульнай гістарычнай канцэпцыі, якою прасякнуты ўвесь твор. Даказаць верагоднасць польскіх хронік другой паловы XVI ст. - гэта значыць супаставіць іх з крыніцамі паведамленняў, якімі карысталіся храністы, разгледзець па магчымасці ступень аўтэнтычнасці апошніх і выказаць, колькі ў іх абодвух ёсць праўды. За аснову параўнання намі прынята «Хроніка Польская, Літоўская, Жмудзкая і Ўсёй Русі» Мацея Стрыйкоўскага.

У **другім раздзеле** аналізуюцца спасылкі М.Стрыйкоўскага на Кадлубка і Длугаша, у выніку чаго становіцца зразумелым, што Кадлубка ён калі і чытаў раней, то не меў пад рукой пад час працы над хронікай і таму цытуе яго ўслед за Кромэрам. Длугаша таксама цытые ў асноўным за Кромэрам і Мяхоўскім. Адзіны доўгі ўрывак, узяты з Длугаша, - гэта прывілей Вітаўта, якім літоўскія роды прымаліся да гербаў польскай шляхты. Падобнымі прыёмамі цытавання карыстаецца Стрыйкоўскі ў адносінах да некаторых заходнееўрапейскіх і старажытных аўтараў.

**Трэці раздзел** трэцяй главы называецца «Рэляцыі Стрыйкоўскага, запазычаныя ў Мехавіты». Другое выданне «Chronicae Polonorum» (1521 г.) Мехавіты было адным з асноўных крыніц паведамленняў Мацея Стрыйкоўскага. Першага выдання ён не ведаў. Стрыйкоўскі справядліва закідваў Мехавіце, што «у яго кожную рэч як у лабірынце шукаць трэба, бо... адну рэч у чатырох і ў пяці раздзелах паклаў, падзяліўшы яе...». Стрыйкоўскі не зразумеў таго, што падобны хаатычны парадак быў вынікам адмовы Мехавіты ад ранейшага храналагічнага спосабу апавядання фактаў, які ён замяніў групаваннем іх паводле асаблівых прынцыпаў, якія сапраўды часам цяжка зразумець. Мехоўскі аказаў Стрыйкоўскаму вялікую паслугу, шмат пішучы пра Русь і Літву. Можна з упэўненасцю сказаць: чаго Стрыйкоўскі не знайшоў у старажытнарускіх і беларуска-літоўскіх летапісах, тое запазычыў у Мехавіты.

У **чацьвёртым раздзеле** трэцяй главы аналізуюцца суадносіны Стрыйкоўскага з Кромэрам, твор якога «De origine et rebus gestis Polonorum libri XXX» з'яўляецца другой па важнасці крыніцай хронікі Стрыйкоўскага. Перад яго вучонасцю апошні схіляў галаву, лічыў яго «доктарам ва ўсіх навуках, не толькі ў гісторыях дасканала дасвечанага», што ён «польскую гісторыю з цемры і з глыбока закрытых безданяў выкапаў і асвяціў». На падставе паведамленняў Кромэра Стрыйкоўскі піша ў асноўным польскую гісторыю, а таксама стасункі Польшчы з Руссю і Літвой. Стрыйкоўскі спасылаецца нібыта на другое выданне Кромэра з 1558 года, але на самой справе яго спасылкі адпавядаюць трэцяму выданню з 1568 года.

Стрыйкоўскаму ўласцівы крытычны падыход да сваіх крыніц. Крытычна ён ставіўся і да Кромэра, напрыклад, не згадзіўся з ім, што пад час выправы Казімежа Вялікага з Людвікам Венгерскім на Літву ў 1351 годзе трапіў у польскі палон, а пазней выбраўся з вязеня, даўшы абяцанне ахрысціцца, князь Любарт, а не яго брат Кейстут. Але часам Стрыйкоўскі некрытычна прымае паведамленні Кромэра. Так, апошні пад 1394 і 1397 гадамі памылкова піша аб адной і той жа перамозе Вітаўта над трыма татарскімі правадырамі, што паўтарае Стрыйкоўскі, дадаўшы да сухой нататкі Кромэра паляўнічыя "падрабязнасці".

Розніца ў цытаванні Стрыйкоўскім Механіты і Кромэра ў тым, што Механіту ён ніколі не скарачаў, а Кромэра механічна абразае, выкідваючы цэлыя сказы. Аказваецца, ён проста карыстаўся творам «Chronica sive historiae Polonicae... descriptio» Я.Гербурта, якая з'яўляецца своеасаблівым канспектам «Гісторыі» М.Кромэра. Гербурт сам прызнаваўся, што «імітуе» Кромэра. Гэта значыць, Стрыйкоўскі «імітаваў» Гербурта, які «імітаваў» Кромэра, які, у сваю чаргу, «імітаваў» Длугаша.

У **пятым раздзеле** разглядаюцца суадносіны Стрыйкоўскага з Бельскім, Вапоўскім і Дэцыем. Апісваючы падзеі да 1506 года, Стрыйкоўскі, акрамя Механіты і Кромэра, выкарыстоўвае яшчэ Марціна Бельскага. Можа здавацца, што ён карыстаўся таксама і Вапоўскім, паколькі досыць часта цытуе яго, але, як аказалася, з Вапоўскім тая ж карціна, што з Кадлубкам. Гэта М.Бельскі, пачынаючы сваю хроніку вывадам польскага народу, напісаў: «Пачынаецца хроніка польская Берната Вапоўскага, нскалі кантара кракаўскага касцёла». Таму Стрыйкоўскі цытаваў Бельскага, спасылаючыся яшчэ і на Вапоўскага, часам нават указваў старонку, каб чытач мог думаць, што справа ідзе аб рукапісу Вапоўскага, у той час як лічбы, названыя пры прозвішчы Вапоўскага на самой справе адносяцца да старонак хронікі Бельскага другога выдання (1554 г.). Калі б Стрыйкоўскі ведаў Вапоўскага, то звярнуў бы ўвагу, што Бельскі сканчвае хроніку на 1548 г., а Вапоўскі на 1535, таму што тады памёр. Па-другое, ужываючы Механіту, павінен быў заўважыць, што да 1506 г. Бельскі ў сваіх паведамленнях зусім ад яго не адрозніваецца. Сёння, дзякуючы І.Хшаноўскаму, мы ведаем, што галоўнай крыніцай «Польскай хронікі» Бельскага да 1506 г. з'яўляецца зусім не Вапоўскі, а Механіта. Але Стрыйкоўскі быў упэўнены, што Бельскі і Вапоўскі - тое ж самае.

Для 1506-1516 гг. галоўнай крыніцай для Стрыйкоўскага стаў Ё.Л.Дэцый, кніга якога «De Sigismundi regis temporibus» (1521 г.) была цудоўнай крыніцай для першых дзесяцігоддзяў XVI ст. Бельскі таксама карыстаўся Дэцыем, але Стрыйкоўскі на гэты раз не спыняецца на цытаванні Бельскага, а бярэ арыгінал Дэцыя. Непасрэдна з Дэцыя Стрыйкоўскі ўзяў матэрыял да ўсёй XXIII і часткі XXIV кніг. Пачаў ад уступлення на трон Жыгімонта Старога і спачатку амаль перакладаў Дэцыя, апускаючы і скарачаючы тое, што лічыў патрэбным.

Акрамя Дэцыя і Бельскага на перыяд 1506-1516 Стрыйкоўскі карыстаўся працай Герберштэйна «Rerum Moscoviticarum commentarii». Пасля 1516 года Стрыйкоўскі вяртаецца да хронікі Марціна Бельскага. Але, калі мы параўнаем частку хронікі Стрыйкоўскага, якая ахоплівае 1517-1548 гг., з гэтымі ж гадамі хронікі Бельскага, то заўважым значную розніцу: першы не толькі скарачае апошняга, альбо ўвогуле апускае некаторыя паведамленні, але дадае шмат уласных паведамленняў.

Акрамя друкаваных крыніц Стрыйкоўскі меў яшчэ рукапісныя, аб чым указваецца ў **шостым раздзеле** трэцяй главы дысертацыі. Менавіта карыстаючыся імі ён надаў свайму твору характар крыніцы. Шэраг старажытных крыніц дайшоў да нашых дзён толькі ў складзе хронікі Стрыйкоўскага, у аўтарскім пераказе, на што звяртаюць увагу ў сваіх працах М.М.Улашчык і А.І.Рогаў.

Стрыйкоўскаму залежала на тым, каб выкарыстаць шмат крыніц, паказаць сваю эрудыцыю. У той жа час ён не быў сапраўдным гісторыкам у сёняшнім разуменні гэтага слова, паколькі дбаў не столькі аб гістарычнай праўдзе, колькі аб напісанні свайго твору. Маючы некалькі крыніц, якія ён выкарыстоўваў для кампіляцыйнай працы, і ведаючы іх узаемны стасунак, аднак не мог пакласці ў аснову сваёй працы першасную з іх, а выбіраў іх адвольна, што было пад рукой.

**Чацьвёртая глава** дысертацыі аналізуе творы польскіх храністаў 2-й паловы XVI ст. як крыніцы па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага, прычым **першы раздзел** прысвечаны праблемам этнагенезу і мовы ў творах Бельскіх, Кромэра і Стрыйкоўскага. Гэты аспект ўяўляе з сябе вялікую цікавасць у сувязі з узрастаннем у сучасным свеце значэння праблемы народа, дзяржавы і грамадства. Гэтыя пытанні цікавілі і храністаў XVI ст., аднак у іх назіраецца шмат блытаніны. Так, у хроніцы Стрыйкоўскага, які паставіў мэту стварыць гісторыю «літоўскага народу», нельга вылучыць гісторыю асобна беларусаў, літоўцаў ці ўкраінцаў. Пад «літоўскім народам» належыць разумець палітычны народ, г.зн. грамадзянаў Вялікага княства Літоўскага. Таксама і Бельскія з Кромэрам супрацьпастаўляюць гісторыі Кароны гісторыю ВКЛ. Толькі тады, калі ў хроніках ідзе гаворка аб рэлігійнай сітуацыі ў X - XVI ст.ст., усплываюць некаторыя этнічныя адрозненні ў тагачасным грамадстве. Напрыклад, прыняцце хрысціянства ў Кіеве ў 988 годзе выразна звязваецца са славянскім этнасам, у той час як увядзенне афіцыйнай каталіцкай рэлігіі ў 1387 годзе Ягайлам датычылася ў першую чаргу этнічных літоўцаў. Марцін Бельскі не

надаваў гэтаму істотнага значэння, у той час калі Стрыйкоўскі падкрэсліваў гэты факт, змяняючы ўласныя імёны на літоўскі манер у тэксце, які ён запазычыў у Бельскага.

Этнічнай гісторыі польскія храністы надавалі вялікую ўвагу, аднак не маглі ў гэтым пытанні выйсці за межы пануючых у тыя часы догмаў. На грунце падобных догмаў яны будавалі свае гіпотэзы, якія часам станавіліся дамінуючымі на працягу доўгіх часоў. Так узніклі так званая «сармацкая тэорыя» і легенда аб рымскім паходжанні літоўскай знаці. Першую развілі і ўмацавалі на польскай глебе Марцін Бельскі і Марцін Кромэр, аўтарам жа другой можна лічыць Мацея Стрыйкоўскага.

М.Бельскі прызнаваў, што сказаць што-небудзь пэўнае аб пачатковай славянскай гісторыі вельмі цяжка з-за браку крыніц. Галоўнай крыніцай для яго, як і для Стрыйкоўскага і Кромэра, з'яўлялася Біблія, адкуль яны ўзялі Яфета, сына Ноя, родапачынальніка многіх еўрапейскіх народаў, у тым ліку славянаў. Толькі Кромэр палякаў выводзіў не ад Яфета, а ад Асармота.

Стварэнне фантастычных нацыянальных генеалогій, звязаных са старажытнасцю, робіцца ў эпоху Адраджэння агульнаеўрапейскай тэндэнцыяй. Пры вывучэнні легенды аб рымскім паходжанні літоўскай знаці ўласна змест трэба адсоўваць на задні план, а на першы план выводзіць пытанне, што стваральнікі дадзенай легенды хацелі ў ёй выявіць.Распаўсюджанне рымскай легенды сярод літвінаў у XV - XVI стст. разглядаецца аўтарам дысертацыі на фоне палітычнай сітуацыі ў ВКЛ. Апроч таго, з'яўленне гэтага міфа ў XVI ст. сведчыць перш за ўсё аб існуючай у Літве патрэбе этнічнага самаакрэслення. Па сутнасці гэта легенда была не толькі антыпольскай, але і антымаскоўскай, паколькі ўзнікла яна як водгук на канфлікты з Польшчай, але развівалася і ўмацоўвалася ў XVI ст., калі галоўным ворагам ВКЛ было Маскоўскае княства. У найбольш шырокім выглядзе легенда выкладзена ў шасці беларуска-літоўскіх летапісах і ў працах М.Стрыйкоўскага. Яму належыць спроба пагадзіць паміж сабой рымскую легенду паходжання ліцвінаў і сармацкую тэорыю паходжання палякаў. Пасля Люблінскай уніі Стрыйкоўскі і іншыя храністы пагадзілі абодзьве тэорыі такім чынам, што нібыта рымскія патрыцыі, прыплыўшы ў Літву, засталі тут сармацкія народы. Стрыйкоўскі піша: «І ліцвіны, і палякі выходзяць з адзінага сармацкага пня, прычым шляхта літоўская дзеліцца на рымскую і сармацкую». Пад гэтымі словамі трэба разумець, што беларускай шляхце ад гэтага часу належала прыняць ідэалогію сарматызму. Як заснавальнік гістарычнай канцэпцыі, закліканай аб'яднаць беларускую і літоўскую шляхту, Стрыйкоўскі зрабіў удалую спробу аб'яднаць і этнічную гісторыю двух асноўных супольнасцяў ВКЛ, так што цяпер нам цяжка адрозніць у кантэксце, дзе ідзе гаворка аб беларускім элеменце, а дзе - аб літоўскім. Прычым, падобны сімбіёз нельга лічыць штучным вытворам Стрыйкоўскага: дзеля падобнага ўспрыняцця рэчаіснасці напрыканцы XVI ст. склаліся рэальныя сацыяльна-палітычныя і этнакультурныя ўмовы.

У польскіх хроніках XVI ст. сінкрэтычна разглядаюцца праблемы культуры, рэлігіі, мовы. Мацей Стрыйкоўскі выразна падзяляе мову літоўскага і беларускага этнасаў, вядома, што ён валодаў і той і другой. Аднак, як Стрыйкоўскі, так і Кромэр і Бельскі нічога дакладнага не маглі сказаць аб літоўскай мове. Кромэр, напрыклад, пісаў: «З таго часу як Літва мелася па-руску размаўляць, літоўская мова не была ўжытковая, адно тут, над марскім берагам, дзе сёння Прусы, Жмудзь, Інфлянты, аж да Віліі». Стрыйкоўскі звязвае складанасць мовы жыхароў ВКЛ са складанымі этнагенетычнымі працэсамі, якія адбываліся на гэтай зямлі: «Пліній... Салініій... Кранцый, Страбон, Пампоній Мела... тыя народы ў Літоўскіх старанах кладуць: Эседоны, Эвазы, Гоці (мабыць Готы), Цымеры і Цымбры, Месеманы, Кастабокі, Літаланы, Хаатры, Раксаланы, Геты, Тусагеты, Неўры, каторых Салінус над Дняпром кладзе, Гелоны, Аланы, Агатырсы, і іншымі рознымі імёнамі іх называюць; адсюль аказваецца, што тыя краіны літоўскія... не адзін народ у сабе выхавалі і размножылі. Чаму таксама і ў мове сваёй паспалітай шмат слоў так лацінскіх, як іншых народаў намешаных поўна маюць». Бельскі адназначна сцвярджае: «Рускія нашы браты маюць у параўнанні з намі перавагу, бо пішуць і чытаюць на роднай мове, а мы на чужаземнай лацінскай».

**Другі раздзел** чацьвёртай главы дысертацыі прысвечаны гісторыі рэлігіі ў ВКЛ. Самы багаты матэрыял аб старажытных вераваннях жыхароў Вялікага княства Літоўскага ўтрымліваецца ў хроніцы Стрыйкоўскага. Паганству ён прысвяціў цэлы раздзел у чацьвёртай кнізе пад назвай «Аб старажытных абрадах альбо дакладней шаленствах рускіх, польскіх, жамойцкіх, літоўскіх, ліфляндскіх і прускіх жыхароў-ідалапаклоннікаў і разнастайнасць іх багоў ілжывых». У сувязі з легендай аб рымскім паходжанні літоўскай знаці прымітыўны паганскі політэізм пад пяром Стрыйкоўскага набывае кшталт развітай рэлігійнай сістэмы старажытных грэкаў і рымлянаў. Паводле беларуска-літоўскіх летапісаў ён апісвае пахавальны абрад старажытных ліцвінаў, а таксама шматлікія святы, якім сам быў сведкай, Дзяды, Купалле і інш.

Больш за ўсё інфармацыі аб хрышчэнні Русі і Вялікага княства Літоўскага таксама знаходзіцца ў хроніцы М.Стрыйкоўскага, хаця пішуць аб гэтым і Бельскія, і Кромэр (галоўнай крыніцай іх паведамленняў быў Длугаш). Як некалі ў Кіеве прыняццю хрысціянства папярэднічала аб'яднанне ўсіх паганскіх багоў у адзіны пантэон, так і ў Літоўскай дзяржаве спачатку ўзнікла агульнае свяцілішча, якое павінна было зрабіцца адначасова не толькі рэлігійным і ідэалагічным, але і адміністрацыйным цэнтрам. У пятым раздзеле трынаццатай кнігі Стрыйкоўскі прыводзіць урыўкі з прывілея, які вызваляў каталіцкую царкву ад падаткаў у 1387 г., копію якога на лацінскай мове ён атрымаў ад Юрыя Юр'евіча Слуцкага. Бясслаўна скончаная кароткая гісторыя хрышчэння Міндоўга і драматычныя падзеі рэлігійнага жыцця ўсяго XIV ст. знайшлі адлюстраванне на старонках хронікі Стрыйкоўскага. Храністы уважліва разглядаюць этнакультурныя і канфесійныя праблемы да часоў панавання

Ягайлы і Вітаўта ўключна, пасля чаго іх пачынаюць больш цікавіць палітычныя падзеі, і яны толькі спарадычна вяртаюцца да этнарэлігійных пытанняў.

## ВЫСНОВЫ

1. Польскія хронікі другой паловы XVI ст. плённа вывучаліся польскімі, літоўскімі, рускімі, украінскімі і беларускімі гісторыкамі, але няма яшчэ спецыяльных даследаванняў, прысвечаных гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў польскіх хроніках. Упершыню ў дысертацыі ўзятыя разам творы чатырох аўтараў разглядаюцца ў комплексе як крыніцы па гісторыі ВКЛ. Гістарыяграфія гэтай праблемы стварае асобны аб'ект даследавання. За 400 год існавання яна склала агромністы комплекс прац рознай вартасці. У дысертацыі сістэматызавана і прааналізавана гісторыя вывучэння польскіх хронік, што дазваляе высветліць, якія праблемы, звязаныя з польскімі хронікамі, разглядаліся лепей, якія горш, якія не былі даследаваны ўвогуле.

2. У дысертацыі робіцца спроба прасачыць узаемадачыненні ўсіх польскіх хронік у рамках аднаго жанру, іх стасункі адна да адной. Будучы кампіляцыяй, кожная хроніка мае большую ці меншую ступень адэкватнасці і верагоднасці і, такім чынам, з'яўляецца ў большай ці меншай ступені верагоднай крыніцай. Высветліць ступень верагоднасці польскіх хронік 2-й паловы XVI ст. як крыніц па гісторыі ВКЛ таксама было задачай нашай дысертацыі. Дзеля гэтага супастаўляліся творы Кромэра, Бельскіх, Стрыйкоўскага з творамі папярэднікаў і паміж сабой, вылучаны іх першакрыніцы. Крыніцазнаўчы аналіз дазволіў паказаць у хроніках аўтэнтычную інфармацыю, у тым ліку і ўласныя заўвагі аўтараў, якія надаюць хронікам характар гістарычных крыніц.

3. Вялікую цікавасць для асэнсавання гістарычнай канцэпцыі храністаў уяўляюць жыццяпісы Марціна Кромэра, Марціна і Яхіма Бельскіх, Мацея Стрыйкоўскага. Менавіта перыпетыі жыцця паўплывалі на іх ідэйныя пазіцыі і погляды, якія, у сваю чаргу адлюстраваліся ў гістарыяграфічнай канцэпцыі аўтараў.

4. Найбольш складанымі, бадай, з'яўляюцца этнагенетычныя погляды храністаў 2-й паловы XVI ст., у якіх пераплецены біблейскія, рэнэсансна-антычныя і прымітыўна-навуковыя пачаткі. Вельмі цяжка рэканструяваць этнагенез народаў ВКЛ на падставе адпаведных паведамленняў храністаў XVI ст., якія хутчэй прадстаўляюць цікавасць як адлюстраванне пануючых у тагачаснай навуцы ідэй, чым дакладную крыніцу аб пачатках народаў і дзяржавы.

Рэлігійная гісторыя займае даволі вялікае месца сярод паведамленняў пра ВКЛ. Яе можна падзяліць на дахрысціянскі і хрысціянскі перыяды. Тут бясспрэчны прыярытэт належыць паведамленням Мацея Стрыйкоўскага,

які пакінуў цікавыя звесткі аб паганскіх вераваннях і культах у ВКЛ, аб прыняцці праваслаўя і каталіцтва, аб касцельных уладаннях.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ


1. Падзеі Лівонскай вайны (1558-1583) на Полаччыне (у «Хроніцы» Мацея Стрыйкоўскага) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі (Навуковая канферэнцыя, прысвечаная 1130-годдзю Полацка). - Полацк, 1992. - С.52-53.
2. Творы Мацея Стрыйкоўскага як крыніцы па гісторыі рэлігіі Вялікага княства Літоўскага // Гістарычна-археалагічны зборнік. Памяці Міхася Ткачова. Мінск, 1993. - Ч.1. - С.109-123.
3. Мацей Стрыйкоўскі ў Вялікім княстве Літоўскім // Спадчына. - 1995. - № 1. - С.2-10.
4. Гродна ў летапісах і польскіх хроніках // Пытанні адукацыі і выхавання. Навукова-метадычны веснік Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. - Гродна, 1995. - № 2. - С.5-17.
5. Марцін і Яхім Бельскія - гісторыкі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага // Спадчына. - 1996. - № 1. - С.26-48.
6. Польскія хронікі 2-й паловы XVI ст. як крыніцы па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага // Наш радавод. - Гродна, 1996. - № 7. - С.227-232.
7. Kultura tradycyjna i wieżenia w Wielkim Księstwie Litewskim w świetle polskich kronik XVI w. // Narod i religia. Materiały z sesji naukowej pod redakcją Tadeusza Stegnera. - Gdańsk, 1994. - S.118-123.


## РЭЗЮМЭ


Семянчук Альбіна Аляксандраўна. Польскія хронікі другой паловы XVI ст. як крыніцы па гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

Наратыўная крыніца, крыніцазнаўства, гістарыяграфія, хроніка, этнакультурная гісторыя, верагоднасць, этнагенетычная легенда, выданне, Вялікае княства Літоўскае, Каралеўства Польскае.

Аб'ект даследавання: польскія хронікі 2-й паловы XVI ст. (Марціна і Яхіма Бельскіх, Марціна Кромэра, Мацея Стрыйкоўскага).

Мэта работы: даказаць, што польскія хронікі другой паловы XVI ст. з'яўляюцца верагоднай крыніцай па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага; увесці іх у навуковы ўжытак у Беларусі.

На падставе крыніцазнаўчага аналізу польскіх хронік другой паловы XVI ст. паказана, што яны могуць быць верагоднай крыніцай інфармацыі.

Паказаны этапы вывучэння польскіх хронік. Прааналізаваны паведамленні храністаў па этнакультурнай і рэлігійнай гісторыі.

Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў навуковых даследаваннях і спецыяльных курсах па гісторыі Беларусі эпохі Вялікага княства Літоўскага.

## РЕЗЮМЕ

Семенчук Альбина Александровна. Польские хроники второй половины XVI века как источник по истории Великого княжества Литовского.

Нарративный источник, источниковедение, историография, хроника, этнокультурная история, достоверность, этногенетическая легенда, издание, Великое княжество Литовское, Королевство Польское.

Объект исследования: польские хроники 2-й половины XVI века (Мартина и Иоахима Бельских, Мартина Кромера, Матея Стрыйковского).

Цель работы: доказать, что польские хроники второй половины XVI в. являются достоверным источником по этнокультурной и религиозной истории Великого княжества Литовского; ввести их в научный оборот в Беларуси.

На основании источниковедческого анализа польских хроник второй половины XVI в. показано, что они могут быть достоверными источниками информации. Показаны этапы изучения польских хроник 2-й половины XVI века. Проанализированы сообщения хронистов по этнокультурной и религиозной истории.

Полученные результаты могут быть использованы в научных исследованиях и специальных курсах по истории Беларуси эпохи Великого княжества Литовского.

Практическое значение диссертации заключается в том, что полученные результаты и материалы могут быть использованы в дальнейшей разработке историко-источниковедческой проблематики истории Беларуси, при составлении хрестоматий и сборников документов по белорусской истории эпохи Великого княжества Литовского, при подготовке лекций и спецкурсов. Результаты работы используются диссертантом в учебно-педагогической и популяризаторской работе: проведении лекций, написании научных и научно-популярных статей.

## SUMMARY

Siemianchuk Albina Alyaxandrauna. The Polish Chronicles of the Second Part of the XVI century as the Sources of the History of the Grand Duchy of Lithuania.

Narrative source, historiography, chronicle, edition, Grand Duchy of Lithuania, Polish Kingdom.

Object of the research: Polish chronicles of the second part of the XVI century (Marcin and Ioachim Bielski, Marcin Kromer, Maciej Stryjkowski).

Purpose of the work: to prove the Polish chronicles are reliable historical sources on ethnocultural and religious history of the Grand Duchy of Lithuania; to introduce them in Belorusian historiography. On the grounds of analyse of the chronicles of the second part of the XVI century are shown, that they are the reliable historical sources, the stages of the studying of the Polish chronicles, and analised the ethnocultural and religios information of the chroniclers. The materials of the research give possibility to introduce in Belorusian historiography a new category of narrative sources.

The obtain conclusions may be used in scientific researches, in special cources on the history of Belarus of the epoc of the Grand Duchy of Lithuania.

Подписано к печати I3.05.97
Формат 60х84/I6. Объем I,0 уч.-изд.л. Тираж 80 экз. Заказ 77

Отпечатано на технике Гродненского государственного
университета имени Янки Купалы.
230023, г.Гродно, ул.Ожешко, 22

301504

Ab 70.944